IV Звычайная нядзеля

Аўтар: кс. Юрый Марціновіч
30.01.2022 00:00



Лк 4, 21–30 Езус пачаў гаварыць у сінагозе: “Сёння споўніліся гэтыя словы Пісання, якія вы чулі”. І ўсе сведчылі Яму і здзіўляліся словам ласкі, якія выходзілі з вуснаў Ягоных, і казалі: “Ці не сын Юзафа гэта?”. І Ён сказаў ім: “Напэўна, скажаце мне такую прыказку: Лекар, вылечы самога сябе; зрабі і тут, у тваёй бацькаўшчыне, тое, што, як мы чулі, сталася ў Кафарнауме”. І сказаў: “Сапраўды кажу вам: ніводзін прарок не з’яўляецца пажаданым на сваёй бацькаўшчыне. Па праўдзе кажу вам: шмат ўдоў было ў Ізраілі ў дні Іллі, калі зачыненым было неба тры гады і шэсць месяцаў, так што быў вялікі голад па ўсёй зямлі. І да ніводнай з іх не быў пасланы Ілля, а толькі да жанчыны, удавы, у Сарэпту Сідонскую. Шмат таксама было пракажоных у Ізраілі ў часы прарока Елісея, і ніводзін з іх не быў ачышчаны, апрача Наамана Сірыйца”. Пачуўшы гэта, усе ў сінагозе напоўніліся гневам і, устаўшы, выгналі Яго прэч з горада, і павялі на вяршыню гары, на якой быў пабудаваны іх горад, каб скінуць Яго.

Але Ён, прайшоўшы паміж іх, адышоў. †

Адкрыцца на Бога

Прыход Езуса ў Назарэт – гэта пілігрымка да каранёў, вяртанне ў тое месца, дзе Слова стала Целам. Тут Ён спазнаў гісторыю, традыцыі і мову.

Гэта месца сустрэчы з Богам у сямейнай супольнасці, дзе важную ролю адыгралі чалавечыя і боскія карані. Езус ідзе туды, быццам нешта забыўся.

Быццам хоча дапоўніць успамін, там здзяйсняе свае прарочыя прыміцыі.

Таму не дзіўна, што мы бачым і чуем Хрыста, які навучае ва ўласным сямейным асяроддзі ў Назарэце, таму што Ён заўсёды прыходзіць і вучыць “сваіх”. Сваімі назваў тых, хто выконвае Яго волю. “Не кожны, хто кажа Мне: «Пане, Пане», увойдзе ў Нябеснае Валадарства, але той, хто выконвае волю Айца Майго, які ў нябёсах” (Мц 7, 21).

Езус, наш Збаўца, любіць кожнага, нават паганца і малавернага.

Не важна паходжанне чалавека, яго гісторыя жыцця, культура, мова – мы ўсе аднолькавыя для Бога, мы Яго любімыя дзеці.

Давайце вучыцца кожны дзень прымаць Езуса ў сваё жыццё. Няхай Ён стане самым галоўным у нашых сем’ях і няхай заўсёды будзе нам патрэбны.

Пане Езу Хрысце, учыні мяне здольным выконаць Тваю волю з адкрытым сэрцам і з радасцю!